# К к













к

кі ку ко ка









к

!! Гэ́та так?







| Ку-ку! | Ко-ко-ко! | Кар-кар! |
|---|---|---|
| Ку-ку! | Ко-ко-ко! | Кар-кар! |




?!



карп
Карп



с л м а і ы у ў г п т о э р ч н

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| ка́са | каса́ | ра́ма | раса́ | кіно́ |
| ка́сы | ко́сы | кра́ма | краса́ | тэа́тр |

## Гэ́та ка́сы






Гэ́та кра́ма.
Тут ка́са і чэк.
Кі́ра — касі́р.
Мы чака́лі чэк.
— Калі́ ла́ска, чэк!

Гэ́та клас.
Тут ка́са лі́тар.
У Кі́ма лі́тары.
— Калі́ ла́ска,
лі́тару **К** і лі́тару **І**.

## Гэ́та ко́сы





У Ні́кі ко́сы,
а ў Лі́кі каса́.
Каса́ — Лі́кіна краса́.

Гэ́та рака́.
Тут каса́.
Там ка́чкі і чо́мгі.

К



Правообладатель Академия образования

| | | | |
|---|---|---|---|
| клас | ко́ні | мір | старт |
| уро́к | ко́нік | мі́рна | ска́-ча |
| уро́кі | кні́га | смі́рна | стра-ко́-ча |

## Уро́кі

Гэ́та клас. У нас уро́кі.

Ка́са лі́тар, кні́га. Мы чыта́лі: ма-ма, та-та. Гэ́та ўрок … .

У нас про́пісі. Мы а-ку-ра́-тна піса́лі лі́тары. Гэ́та ўрок … .

5 мі́нус 2 ро́ўна тры. Чаты́ры — гэ́та тры і … . Гэ́та ўрок … .

Ко́нік страко́ча. По́ні ска́ча. По́ні — гэ́та ко́ні. Гэ́та ўрок … .




Смі́рна! На старт! Гэ́та ўрок … .

Ало́ўкі, пар-трэ́т. Гэ́та ўрок … .

Лісты́, пластылі́н. Гэ́та ўрок … .

Но́ты. Рытм. Гэ́та ўрок … .

с л м а і ы у ў г п т о э р ч н

Ра́нкам Рыго́рка клі́каў Кіры́ла на го́рку.

## Капі́кулы

У нас капі́кулы. Мы гу́ртам на го́рку!

У Кары́ны, Кіры́ла, Рыго́ркі і Акса́ны са́нкі. Кіры́л ката́ў Кары́ну. Рыго́р ката́ў Акса́ну. По́тым…





### Мы — мастакі́!



У Мікі́ты партрэ́т Міла́ны.
У Міла́ны партрэ́т Мікі́ты.

К



Правообладатель Академия образования